Сімакова, І. М. Камплектаванне фондаў дзяржаўных этнаграфічных музеяў Беларусі ў другой палове ХХ — пачатку XXI ст. / Сімакова І. М. // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : навук. зб. Вып. 7 / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2012. — С. 157-164.

І. М. СІМАКОВА

# КАМПЛЕКТАВАННЕ ФОНДАЎ ДЗЯРЖАЎНЫХ ЭТНАГРАФІЧНЫХ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ ХХ – ПАЧАТКУ XXI ст.

Этнаграфічныя матэрыялы захоўваюцца сёння ў асноўным у комплексных (краязнаўчых) музеях краіны (50 % ад агульнай колькасці музеяў рэспублікі), а таксама гістарычных і этнаграфічных (разам складаюць 17 %). Калекцыі этнаграфіі ўяўляюць сабой невялікую групу (3 %) Дзяржаўнага музейнага фонду Рэспублікі Беларусь [8, с. 6]. Гэтыя прадметы з'яўляюцца крыніцавай базай сучаснай айчыннай этнаграфічнай навукі і вывучаюцца як супрацоўнікамі саміх музеяў, так і даследчыкамі з іншых пазамузейных устаноў.

Беларускія музеі назапасілі вялікі вопыт выяўлення і збору этнаграфічнага матэрыялу. Ужо ў канцы XVIII ст. у прыватным зборы Ганны Ябланоўскай у Сямяцічах былі сабраны этнаграфічныя калекцыі па культуры розных народаў. Сярод публічных музеяў, якія займаліся выяўленнем і папулярызацыяй этнаграфічнай спадчыны, неабходна адзначыць Віленскі музей старажытнасцей, адкрыты ў 1856 г. Прадметы этнаграфіі знайшлі свае месца ў прыватных зборах К. Тышкевіча, А. Ельскага, І. Луцкевіча і інш. У выніку развіцця краязнаўчага руху ў першай палове ХХ ст. за кошт этнаграфічных калекцый пашырылі свае фонды краязнаўчыя музеі краіны. На жаль, значная частка гэтых збораў была страчана. Тыя, што захаваліся, у пасляваенны час былі ўнесены ў інвентарныя кнігі музеяў, аднак высветліць крыніцы паступлення гэтых прадметаў у музей у большасці выпадкаў ужо не ўяўляецца магчымым.

**Сімакова Іна Мікалаеўна** — аспірант кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Сучасныя фонды этнаграфічных музеяў пачалі камплектавацца ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі. «Палажэннем аб раённым краязнаўчым музеі», распрацаваным Міністэрствам культуры БССР у маі 1954 г., быў абумоўлены пачатак планамернай экспедыцыйнай дзейнасці па выяўленні і збіранні прадметаў матэрыяльнай культуры раёнаў. Не магло не адбіцца на музейнай дзейнасці развіццё этнаграфічнай навукі, у прыватнасці, стварэнне Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР у 1957 г. Значна папоўніліся этнаграфічныя калекцыі шэрагу музеяў па ініцыятыве мясцовага насельніцтва, што было выклікана развіццём урбанізацыйных працэсаў і знікненнем з планаў гарадской забудовы старой драўлянай архітэктуры. Прадметы музейнага значэння, якія выйшлі з ужытку і сталі непатрэбнымі ўладальнікам у новых гарадскіх умовах жыцця, пачалі паступаць у музеі.

Значная праца па выяўленні і збіранні этнаграфічных матэрыялаў была праведзена Дзяржаўным музеем БССР (сёння — Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, далей — НГМ). Распараджэнне Савета Міністраў БССР аб яго стварэнні было прынята ў снежні 1956 г., а ўжо праз паўгода, у чэрвені 1957 г., супрацоўнікамі была здзейснена першая этнаграфічная экспедыцыя ў Ганцавіцкі раён Брэсцкай вобласці і Краснаслабодскі раён Мінскай вобласці з мэтай набыцця прадметаў беларускага народнага побыту і культуры. У выніку першага этнаграфічнага даследавання ў фонды паступіла 116 прадметаў (беларускае народнае адзенне, мастацкія тканіны, хатняе начынне, сельскагаспадарчы інвентар і г. д.). Набытыя матэрыялы сталі першымі прадметамі музейнага фонду. Першы запіс Кнігі паступленняў — гэта ткацкі станок з Краснаслабодскага раёна [4, с. 13]. У наступныя дзесяцігоддзі экспедыцыі праводзіліся штогод.

Дзяржаўны музей БССР на той момант быў адзінай музейнай установай у рэспубліцы, плошча этнаграфічнага абследавання якой ахоплівала ўсю тэрыторыю Беларусі. У навуковым архіве музея захавалася значная колькасць экспедыцыйных матэрыялаў, на падставе якіх можна сцвярджаць, што вывучэнне этнаграфіі краіны з’яўлялася адным з прыярытэтных накірункаў яго дзейнасці. Тлумачылася гэта, па-першае, зацікаўленасцю супрацоўнікаў музея і пазамузейных спецыялістаў-этнолагаў, якія прымалі актыўны ўдзел у музейным жыцці, у зберажэнні этнаграфічнай спадчыны краіны. Па-другое, у савецкі час фонды неабходна было камплектаваць так, каб яскрава прадэманстраваць дасягненні сацыялістычных пераўтварэнняў на вёсцы ў параўнанні з яе бед-

насцю ў дарэвалюцыйны час. Таму асобная ўвага надавалася набыццю этнаграфічных матэрыялаў канца XIX — пачатку XX ст. Акрамя таго, у першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі ўласна гістарычныя матэрыялы выявіць было больш складана ў разбураных гарадах, чым этнаграфічныя прадметы, якія захаваліся ў вяскоўцаў. За кароткі тэрмін існавання музея яго супрацоўнікі здолелі ажыццявіць экспедыцыі ва ўсе вобласці краіны.

Адначасова вялася работа па вывучэнні традыцыйнай гарадской культуры. У жніўні 1959 г. была арганізавана экспедыцыя ў г. Добруш з мэтай збору матэрыялаў, што тычыліся побыту і працоўнага жыцця рабочых папяровага камбіната «Герой працы». У 1960 г. падобная экспедыцыя была праведзена ў г. Ліда, у 1978 г. — у мястэчку Копысь. Асобная ўвага надавалася вывучэнню цэнтраў рамеснай вытворчасці (Нясвіж, Любча, Навагрудак, Шчорсы, Мір і інш.). Дзякуючы гэтым намаганням сучасныя фонды НГМ утрымліваюць значную калекцыю традыцыйнай культуры гараджан.

Апошняе этнаграфічнае даследаванне супрацоўнікі НГМ праводзілі ў 2006 г. у Браслаўскім раёне Віцебскай вобласці. У яго выніку ў фонды музея патрапіла каля 200 прадметаў. У 2010 г. у складзе рэчавых помнікаў музея налічваліся 22 калекцыі, сярод іх восем з'яўляюцца крыніцавай базай этнаграфічнай навукі: «Традыцыйная побытавая этнаграфія», «Мэбля», «Беларускае народнае адзенне», «Метал» (побытавы і прамысловы), «Кераміка. Фарфор. Шкло» (беларуская народная кераміка, прамысловая кераміка, фаянс, фарфор, кафля, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва), «Дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва», «Музычныя інструменты». Да выяўленчых крыніц аднесена калекцыя «Мастацкія промыслы. Вырабы майстроў народнай творчасці» [10].

Асаблівасцю папаўнення этнаграфічных калекцый НГМ у апошні час з'яўляецца тое, што яно ажыццяўляецца не праз экспедыцыйную дзейнасць, а праз іншыя формы камплектавання (закупку, атрыманне ў дар або па завяшчанні; выкананне арыгінальных або капійных работ па заказе музея; абмен з іншымі музейнымі ўстановамі і г. д.).

Буйным цэнтрам, дзе сфарміраваны важныя ў навуковых адносінах этнаграфічныя калекцыі, з'яўляецца Музей старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі (ІМЭФ). У канцы 1969 г. у ІМЭФ быў утвораны сектар «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», які з 1970 г. пачаў праводзіць сістэматычныя экспедыцыі па выяўленні твораў народнага мастацтва і этнаграфіі. Першыя даследаванні ажыццяўляліся на Брэстчы-

не, адкуль былі прывезены каштоўныя абразы, скульптура, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, мастацкія тканіны. З гэтага часу этнаграфічныя экспедыцыі ладзіліся два-тры разы на год. Набытыя прадметы сталі асновай для стварэння Музея старажытнабеларускай культуры ІМЭФ, які быў адкрыты ў маі 1979 г. [7, с. 5]

Вялікая работа была выканана музейнымі энтузіястамі па стварэнні асобнага «Чарнобыльскага фонду», куды ўвайшлі прадметы з выселеных вёсак Чарнобыльскай зоны. Першая экспедыцыя па зборы прадметаў музейнага значэння ў забруджаных рэгіёнах была ажыццёўлена летам 1991 г. па ініцыятыве дырэктара Музея старажытнабеларускай культуры В. Ф. Шматава. Усяго было праведзена больш за 20 выездаў, у выніку якіх у музейныя фонды ўключана каля 2 тыс. прадметаў матэрыяльнай культуры беларусаў. Сёння Чарнобыльскі фонд падзелены на некалькі калекцый: сельскагаспадарчыя прылады працы, прылады для апрацоўкі льну, ткацкія вырабы, рыбалоўны інвентар, побытавыя прадметы [2, с. 45—46].

Яскравым прыкладам дзейнасці па збіранні і вывучэнні этнаграфічнай спадчыны краіны з'яўляецца работа Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту [1], які быў заснаваны паводле пастановы Урада Рэспублікі Беларусь у 1976 г. З гэтага часу і да 1981 г. была праведзена значная навукова-экспедыцыйная работа па пошуку помнікаў народнага дойлідства і зборы прадметаў этнаграфіі. Супрацоўнікам музея ўдалося выявіць каля 5 тыс. аб'ектаў, на падставе чаго быў сфарміраваны фонд музея, у тым ліку і адзіная ў краіне калекцыя «Архітэктура». На тэрыторыі музея сёння прадстаўлена 25 аўтэнтычных будынкаў рознага прызначэння. Усяго запланавана зрабіць даступнымі для наведвальнікаў звыш 250 культавых, жылых, гаспадарчых, грамадскіх і вытворчых пабудоў з шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі [6, с. 34]. Пры музеі сфарміраваны каля 30 тэматычных калекцый: абразы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, ткацтва і вышыўка, народныя строі, пляценне, кераміка і г. д. Колькасна самымі буйнымі сярод іх з'яўляюцца калекцыі тканін, адзення, прадметаў побыту, прыладаў і прыстасаванняў.

Калекцыя этнаграфіі, якая тэрытарыяльна ахоплівае амаль усю Беларусь, сфарміравана ў Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Зас-

[1] Мінскі р-н, п. а. Азярцо.

лаўе». Першыя прадметы этнаграфічнага характару пачалі пастунаць у канцы 1980-х гг. ад жыхароў горада, затым музеем была наладжана планамерная экспедыцыйная дзейнасць. Сёння этнаграфічныя матэрыялы музея размеркаваны па калекцыях: «Абсталяванне жылля», «Абутак», «Адзенне», «Кераміка і шкло», «Метал», «Музычныя інструменты», «Прылады працы», «Ткацтва», «Пляценне», «Транспартныя сродкі і вупраж» [1, с. 2]. У выніку карэкціроўкі канцэпцыі камплектавання апошнім часам перавага ў фарміраванні этнаграфічных калекцый аддаецца Заслаўскаму рэгіёну, аднак прадметы з іншых раёнаў краіны таксама знайшлі сваё месца ў фондах і экспазіцыях запаведніка.

Калекцыя этнаграфіі Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея пачала фарміравацца ў пачатку 1950-х гг. На яе падмурку ў 1981 г. быў адкрыты яго філіял — Магілёўскі музей этнаграфіі. Ажыўленне экспедыцыйнай дзейнасці музея па фарміраванні этнаграфічных калекцый назіралася ў пачатку 1990-х гг. Асобная ўвага надавалася вывучэнню тэрыторыі Магілёўскай вобласці і горада Магілёва. Пры музеі сфарміравана значная калекцыя прадметаў традыцыйнай культуры гараджан (люстэркі, мэбля, музычныя інструменты, асвятляльныя прыборы, пісьмовыя прылады, гадзіннікі і інш.). Прадметы такога кшталту сталі асновай для стварэння экспазіцыі «Магілёў губернскі», якая адлюстроўвае штодзённае жыццё розных сацыяльных груп губернскага горада. Сёння музейныя супрацоўнікі надаюць значную ўвагу набыццю матэрыялаў, якія адлюстроўваюць традыцыйную культуру другой паловы XX ст. У фонды ўключаны тыя прадметы, на якія доўгі час не звярталі ўвагі музейныя практыкі: школьная форма, джынсы фірмы «Мантана» і інш. [9]

Вялікая калекцыя этнаграфіі захоўваецца ў Веткаўскім музеі народнай творчасці, аснову якой склаў прыватны збор Ф. Р. Шклярава. Пастанова аб стварэнні музея была прынята Саветам Міністраў БССР у лістападзе 1978 г. З гэтага часу пачалася актыўная экспедыцыйная дзейнасць на тэрыторыі Веткаўскага і суседніх раёнаў. Толькі за 1983 г., пасля набыцця ўласнага транспарту, супрацоўнікамі было здзейснена больш за 60 выездаў з мэтай выяўлення прадметаў музейнага значэння. Сёння экспедыцыйная дзейнасць музея працягваецца. З 1998 г. музей рэалізуе Праграму комплексных экспедыцыйных даследаванняў рэгіёна — тэрыторыі рассялення славянскіх плямёнаў «Па шляхах старажытных радоў». З 2008 г. праект па вывучэнні беларуска-расійскага памежжа ажыццяўляецца сумесна з Дзяржаўнай адукацыйнай установай сярэд-

няй прафесійнай адукацыі «Навазыбкаўскім прафесійна-педагагічным каледжам» (Расія). Вынікі экспедыцыйных даследаванняў населеных пунктаў уздоўж рэк Сож, Бесядзь, Іпуць і іх прытокаў знайшлі сваё ўвасабленне ў справаздачных выставах («Уздоўж Бесядзі») і выданні калектыўнай манаграфіі музея «Арнаменты Падняпроўя» [3, с. 5]. У музеі сабрана багатая калекцыя традыцыйнага адзення жыхароў Веткаўшчыны, ткацкіх вырабаў і вышыўкі, прадметаў побыту і вырабаў самадзейных майстроў. Гонарам музея з'яўляецца калекцыя ткацтва з в. Неглюбка. Навуковымі супрацоўнікамі была праведзена значная праца па фіксацыі мясцовых святаў і абрадаў, тэхналагічных працэсаў, якія ўвайшлі ў асобны фонд фота- і відэаматэрыялаў.

Фарміраванне калекцыі этнаграфіі Мазырскага аб'яднанага краязнаўчага музея было ініцыявана ў сярэдзіне 1970-х гг. мясцовымі жыхарамі, якія пасля зносу старой драўлянай гарадской забудовы пачалі перадаваць этнаграфічныя матэрыялы ў музей. Значна папоўнілася этнаграфічная калекцыя ў 1994 г. у сувязі з перадачай музею прыватнага збору мясцовага калекцыянера і мастака-кераміста М. М. Пушкара (295 прадметаў). З 2002 г. музей разгарнуў дзейнасць па вывучэнні рэгіёна ў межах праекта «Шляхамі А. К. Сержпутоўскага», які рэалізуецца сумесна з супрацоўнікамі ІМЭФ НАН Беларусі, Інстытута культуры Беларусі і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. З 2002 па 2010 г. было праведзена 5 этнаграфічных экспедыцый: дзве ў Лельчыцкім, па адной — у Петрыкаўскім, Жыткавіцкім, Мазырскім раёнах Гомельскай вобласці [11]. У выніку рэалізацыі праекта музей папаўняе свае фонды рухомымі помнікамі і ажыццяўляе фіксацыю нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны.

Музей беларускага Палесся ў г. Пінску з'яўляецца адным з нешматлікіх, фонды якога ўтрымліваюць матэрыялы, сабраныя да Вялікай Айчыннай вайны. Экспедыцыйная дзейнасць музея па выяўленні прадметаў традыцыйнай культуры была распачата яшчэ ў 1930-я гг. па ініцыятыве стваральніка музея Д. Георгіеўскага. У экспазіцыі даваеннага музея калекцыя этнаграфіі займала самую вялікую плошчу і карысталася попытам у наведвальнікаў [5, с. 29]. Аднак у пасляваенны час выявіць крыніцы паступлення прадметаў са збору Д. Георгіеўскага не ўдалося. У 1970-я гг. музей аднавіў экспедыцыйную дзейнасць на тэрыторыі Палесся (пераважна Брэсцкая і Гомельская вобласці). З 1980-х гг. па ініцыятыве навуковых супрацоўнікаў пачала фарміравацца калекцыя традыцыйнай гарадской культуры, прадметы для якой набываліся ў мясцовых старажылаў.

Этнаграфічныя музеі Беларусі на сучасным этапе развіцця музейнай справы ўключаюць у фонды прадметы, якія адлюстроўваюць культуру не толькі беларусаў, але і іншых этнічных груп. Прыкладам дзейнасці па зборы этнаграфічных матэрыялаў розных этнічных супольнасцей Беларусі можа служыць Іўеўскі музей нацыянальных культур. У фонды музея ўключаны калекцыі, прысвечаныя яўрэйскай абшчыне горада і татарам Іўеўскага рэгіёна. Сёння музеем вядзецца работа па фарміраванні калекцыі традыцыйнай культуры польскага насельніцтва.

Значныя этнаграфічныя калекцыі сабраны ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі, Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, Гомельскім палацава-паркавым ансамблі, Музейным комплексе гісторыі і культуры Аршаншчыны, Браслаўскім раённым аб’яднанні музеяў, Івянецкім музеі традыцыйнай культуры і інш.

Такім чынам, сучасныя этнаграфічныя калекцыі беларускіх музеяў пачалі фарміравацца ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі. З 1970-х гг. былі арганізаваны сістэматычнае выяўленне і даследаванне помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры акадэмічнымі ўстановамі краіны, што паўплывала і на музейную практыку. Уздым дзейнасці музеяў па камплектаванні фондаў прадметамі этнаграфіі назіраўся ў 1990-я гг., што было звязана з агульнай тэндэнцыяй абуджэння цікавасці да гісторыі і культуры краіны ў пераломны перыяд набыцця незалежнасці. Асэнсаванне таго, што прадметы этнаграфіі ў хуткім часе будзе немагчыма выявіць як у вясковым, так і ў гарадскім асяродку, дае важны стымул музейным супрацоўнікам працягваць працу па выяўленні і збіранні прадметаў матэрыяльнай культуры і нематэрыяльных сведчанняў народнай творчасці, распрацоўваць доўгатэрміновыя экспедыцыйныя праекты. Гэтыя мерапрыемствы ў спалучэнні з іншымі формамі камплектавання спрыяюць пашырэнню музейных фондаў і крыніцавай базы этнаграфічнай навукі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Аналіз наяўнага музейнага фонду запаведніка «Заслаўе» і прапановы па калекцыйным камплектаванні // Бягучы архіў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе».

2. *Беляева, С. С.* Коллекция памятников этнографии и народного искусства Чернобыльской зоны / С. С. Беляева // Могилянськi читання 2004: Збiрник наукових праць / Нац. Києво-Печер. іст.-культ. заповiдник; ред. рада: В. М. Колпакова (вiд. ред.) [та iн.]. Київ, 2005. С. 45—50.

3. Действующие в учреждении «Ветковский музей народного творчества» внутренние долговременные программы и проекты / Навуковы архіў Веткаўскага музея народнай творчасці.

4. *Калымага, Н.* Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі: камплектаванне музейнага збору ў 1957—1967 гг. / Н. Калымага, А. Ладзісаў // Музейны веснік. 2008. Вып. 4. С. 13—17.

5. *Лабачэўская, В. А.* Захавальнік Палескага музея Дзмітрый Георгіеўскі / В. А. Лабачэўская. Мінск : Тэхналогія, 2001.

6. *Локотко, С.* Белорусский скансен: проекты, реальность и перспектива / С. Локотко // Музеи Литвы и Беларуси: пути и перспективы развития в XXI в. / сост.: Е. Матевосян, В. Повилюнас, А. Сташкевич [и др.]. Минск, 2007. С. 34—36.

7. Музей старажытнабеларускай культуры / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; навук. рэд. В. Ф. Шматаў. Мінск : Бел. навука, 1998.

8. Музейная справа Беларусі: сучасны стан і праблемы развіцця / Бел. дзярж. ін-т праблем культуры; рэдкал.: Л. А. Каткова, З. М. Камароўская, І. Ю. Варанкова [і інш.]. Мінск : БелДІПК, 2004.

9. Научная концепция комплектования фондов Могилевского областного краеведческого музея им. Е. Р. Романова на 2011—2015 гг. // Бягучы архіў Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея ім. Е. Р. Раманава.

10. Прагарама камплектавання фондаў дзяржаўнай установы «Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі» на 2007—2010 гг. // Бягучы архіў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

11. Проект этнокультурного изучения Мозырщины «Дорогами А. Сержпутовского» / Автор проекта В. Т. Сайфутдинова // Навуковы архіў Мазырскага аб'яднанага краязнаўчага музея.

## РЕЗЮМЕ. SUMMARY

Статья посвящена проблеме комплектования этнографических коллекций государственных музеев Беларуси во второй половине XX — начале XXI в. Рассматривается история формирования крупнейших этнографических коллекций страны, представлена их характеристика. Дается анализ экспедиционной деятельности музеев и других мероприятий, направленных на пополнение фондов этнографическими материалами.

The article is devoted to the acquisition of ethnographic collections of public museums in Belarus in the second half of the XX — beginning of the XXI centuries. The article examines the formation of the largest ethnographic collections of the country, presents characteristics of them. It gives the analysis of the expeditionary activities of museums and other activities designed to replenish funds with ethnographic materials.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 25 чэрвеня 2010 г.